ВОДГУК
АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА НА ДЫСЕРТАЦЫЙНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ
АНАНЬКІ КІРЫЛА ДЗМІТРЫЕВІЧА
«БЕЛАРУСКІЯ ГІМНАЗІІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 ГГ.)»
НА САІСКАННЕ ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ
КАНДЫДАТА ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК

*1. Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны*

Дысертацыйнае даследаванне К. Д. Ананькі «Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» цалкам адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя, па якой яна прадстаўлена да абароны. Прадмет даследавання – беларускія гімназіі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд – непасрэдна ўваходзіць у сферу айчыннай гісторыі, паколькі разглядае важны аспект гісторыі беларускай адукацыі, культуры і нацыянальнага руху ў складаны геапалітычны перыяд. Храналагічныя рамкі даследавання (1921–1939 гг.) ахопліваюць ключавы этап фарміравання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах прымусовага ўключэння заходнебеларускіх зямель у склад Польшчы. Пастаўленыя аўтарам мэта і задачы, змест дысертацыі і яе вынікі сведчаць аб адпаведнасці праведзенага даследавання спецыяльнасці «айчынная гісторыя».

*2. Актуальнасць тэмы даследавання*

Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання К.Д. Ананькі не выклікае сумненняў і абумоўлена шэрагам важных фактараў. Дысертацыя прысвечана маладаследаванаму аспекту гісторыі міжваеннай Заходняй Беларусі – функцыянаванню беларускіх гімназій як цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця ва ўмовах асіміляцыйнай палітыкі польскіх уладаў. Гэты перыяд з’яўляецца адным з найбольш складаных у гісторыі беларускага народа, калі вырашаліся пытанні захавання нацыянальнай ідэнтычнасці.

У айчыннай гістарыяграфіі адсутнічае комплекснае навуковае даследаванне дзейнасці беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі. Дадзеная тэма толькі фрагментарна асвятлялася ў працах, прысвечаных агульным пытанням гісторыі міжваеннай Заходняй Беларусі.

У кантэксце сучаснай гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь важным з’яўляецца ўшанаванне памяці аб дзейнасці беларускіх адукацыйных устаноў, якія спрыялі захаванню нацыянальнай культуры і традыцый. Вопыт барацьбы за беларускую школу можа быць выкарыстаны для выхавання патрыятызму сярод моладзі.

Дысертацыйнае даследаванне адпавядае п. 6 «Забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы» Прыярытэтных напрамкаў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на 2021–2025 гады ў Рэспубліцы

Беларусь, зацверджаных Указам Прэзідэнта ад 07.05.2020 № 156. Дысертацыя выканана ў рамках гранта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў «Мой першы грант – 2024» № Г24МП-012 па тэме «Беларускія гімназіі ў міжваенны перыяд: грамадска-палітычны і культурны аспекты» (тэрмін выканання з 02.05.2024 па 31.03.2026).

*3. Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, што выносяцца на абарону*

Дысертацыя К.Д. Ананькі з'яўляецца самастойным даследаваннем, пабудаваным на аснове глыбокага вывучэння шырокага кола архіўных і крыніц, айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Дысертацыя з'яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі комплексным навуковым даследаваннем функцыянавання беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Аўтарам упершыню распрацавана навуковая перыядызацыя дзейнасці беларускіх гімназій, вылучаны чатыры перыяды іх функцыянавання з улікам палітычных і сацыяльна-эканамічных умоў. Упершыню ў вывучэнні беларускіх гімназій прымяняецца метад прасапаграфіі для стварэння калектыўнага партрэта вучнёўскага складу і педагагічнага корпуса. У навуковы зварот уводзіцца шырокі комплекс архіўных матэрыялаў з архіваў Беларусі і Літвы, якія раней не выкарыстоўваліся даследчыкамі. Выяўлены праекты па ўтварэнні беларускіх сярэдніх школ у розных рэгіёнах Заходняй Беларусі, якія раней у айчыннай гістарыяграфіі не згадваліся.

*4. Абгрунтаванасць і даставернасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі*

Абгрунтаванасць і дакладнасць навуковых высноў і вынікаў, да якіх у дысертацыйным даследаванні прыходзіць К.Д. Ананька, грунтуецца на асноватворных прынцыпах гістарычнага даследавання: аб'ектыўнасці, гістарызму і сістэмнасці, а таксама звароце да работ айчынных гісторыкаў і замежнай гістарыяграфіі. Даследаванне абапіраецца на шырокую базу крыніц, якая ўключае дакументальныя і апавядальныя крыніцы з архіваў, музеяў і бібліятэк Беларусі і Літвы. Асабліва каштоўнымі з'яўляюцца эга-дакументы (успаміны, лісты, дзённікі) удзельнікаў падзей.

Выкарыстанне сукупнасці агульнанавуковых і спецыяльна-гістарычных метадаў забяспечвае комплексны аналіз праблемы. Асабліва прадуктыўным для даследавання з'яўляецца прымяненне прасапаграфічнага метаду.

Аўтарам сабраны і сістэматызаваны ўнікальныя статыстычныя дадзеныя аб колькасці вучняў, іх сацыяльным і нацыянальным складзе, што дазваляе зрабіць абгрунтаваныя высновы.

Вызначаная навуковая мэта і задачы раскрыты. Усе высновы лагічна выцякаюць з прааналізаванага матэрыялу і не супярэчаць наяўным навуковым ведам аб гісторыі міжваеннай Заходняй Беларусі.

*5. Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў з пазначэннем рэкамендацый па іх выкарыстанню*

Навуковая значнасць дысертацыйнага даследавання К.Д. Ананькі заключаецца ва ўвядзенні ў навуковы зварот значнага комплексу раней не вывучаных архіўных матэрыялаў з фондаў Беларусі і Літвы, што дазваляе паглыбіць разуменне нацыянальна-культурных працэсаў у міжваеннай Заходняй Беларусі. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі комплексна даследавана дзейнасць беларускіх гімназій як спецыфічных нацыянальна-адукацыйных устаноў, распрацавана навуковая перыядызацыя іх функцыянавання, створаны калектыўныя партрэты вучнёўскага складу і педагагічнага корпуса на аснове прасапаграфічнага метаду. Даследаванне ўносіць істотны ўклад у вывучэнне беларускага нацыянальнага руху, гісторыі адукацыі і культурнага жыцця Заходняй Беларусі.

Практычная значнасць вынікаў даследавання абумоўлена іх актуальнасцю для сучаснай адукацыйнай практыкі і гістарычнай палітыкі дзяржавы. Матэрыялы дысертацыі ўжо знайшлі практычнае прымяненне ў навучальным працэсе ГрДУ імя Янкі Купалы, выкарыстоўваюцца пры выкладанні дысцыпліны «Заходняя Беларусь у складзе Польшчы (1921–1939 гг.)», што пацверджана актам укаранення. Навуковыя вынікі могуць быць выкарыстаны пры стварэнні новых навучальных курсаў па гісторыі Беларусі, падручнікаў і навукова-папулярнай літаратуры.

Сацыяльная значнасць даследавання заключаецца ў яго ўкладзе ў фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і можа быць выкарыстана для патрыятычнага выхавання. Даследаванне спрыяе павышэнню цікавасці грамадства да гісторыі роднага краю, захаванню памяці аб выдатных асобах беларускай культуры.

Эканамічная значнасць вынікаў даследавання ўяўляецца ў іх патэнцыяле для развіцця культурнага турызму і музейнай справы. Матэрыялы дысертацыі могуць стаць асновай для стварэння тэматычных музейных экспазіцый, турыстычных маршрутаў па месцах размяшчэння беларускіх гімназій, што будзе спрыяць развіццю рэгіянальнага турызму і павышэнню прывабнасці гістарычных цэнтраў.

Матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы манаграфій па гісторыі беларускага нацыянальнага руху, адукацыі і культуры XX ст. Вынікі даследавання могуць знайсці далейшае ўкараненне ў навучальным працэсе устаноў вышэйшай і сярэдняй адукацыі пры выкладанні гісторыі беларускай дзяржаўнасці, стварэння на іх аснове спецыяльных курсаў, падрыхтоўцы падручнікаў і метадычных дапаможнікаў.

*6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку*

Ступень апублікаванасці вынікаў дысертацыі адпавядае патрабаванням ВАК РБ. Апублікавана 22 навуковыя артыкулы агульным аб’ёмам 10,6 друк. арк., з якіх 9 - у навуковых часопісах, што адпавядаюць п. 19 Палажэння аб присуджэнні навуковых ступеняў.

Матэрыялы дысертацыі былі апрабаваны на 18 навуковых канферэнцыях рознага ўзроўню. Аўтар мае публікацыі не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.

*7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь*

Змест дысертацыі, яе структура і асноўныя часткі, а таксама аўтарэферат выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь па афармленні дысертацыйных даследаванняў.

Дысертацыя мае лагічную структуру, якая ўключае ўводзіны, чатыры главы, заключэнне, спіс крыніц і 8 дадаткаў. Агульны аб'ём працы – 169 старонак, асноўны тэкст – 119 старонак, што адпавядае нарматыўным патрабаванням.

Спіс выкарыстаных крыніц налічвае 350 найменняў (уключаючы публікацыі аўтара), што сведчыць аб грунтоўнай крыніцазнаўчай працы даследавання.

*8. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка*

Аналіз зместу, выкарыстаных метадаў навуковага пазнання і атрыманых вынікаў, адлюстраваных у кваліфікацыйнай працы і аўтарэфераце дысертацыі К.Д. Ананькі, дазваляюць зрабіць заключэнне:

- па-першае, прадстаўленая кваліфікацыйная работа мае завершаны характар і выканана ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь адносна работ па айчыннай гісторыі;

- па-другое, саіскальнік валодае дастатковай навуковай кваліфікацыяй для правядзення даследаванняў і цалкам адпавядае кваліфікацыйным патрабаванням, што прад'яўляюцца да саіскальнікаў вучонай ступені кандыдата гістарычных навук;

- па-трэцяе, навуковая кваліфікацыя К.Д. Ананькі адпавядае навуковай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

У цэлым станоўча ацэньваючы навуковыя вынікі праведзенага дысертацыйнага даследавання К. Д. Ананькі «Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» неабходна звярнуць увагу на наступныя моманты:

1) метадалагічныя пытанні прымянення прасапаграфічнага метаду. Нягледзячы на наватарскае прымяненне прасапаграфічнага метаду, аўтару варта больш падрабязна абгрунтаваць крытэрыі адбору персаналій для аналізу. У практыцы выкарыстання дадзенага метаду ключавым з'яўляецца дакладнае вызначэнне межаў групы, якая вывучаецца. У дысертацыі не заўсёды ясна, па якіх крытэрыях адбіраліся педагогі і навучэнцы для прасапаграфічнага аналізу для аналізу беларускага руху, з улікам, напрыклад таго, што сярод навучэнцаў беларускіх гімназій былі і іўдзеі;

2) прапрацоўка эканамічных аспектаў функцыянавання гімназій. Аўтар згадвае пра фінансавыя цяжкасці беларускіх гімназій, але не праводзіць

дэталёвага аналізу іх эканамічнага становішча. Адсутнічаюць дадзеныя аб структуры даходаў і выдаткаў, памерах субсідый ад розных арганізацый, што было б важна для разумення механізмаў выжывання гэтых навучальных устаноў;

3) нягледзячы на згадку аб стварэнні падручнікаў і метадычных дапаможнікаў, дэталёвы аналіз зместу адукацыі, навучальных праграм і іх эвалюцыі прадстаўлены фрагментарна. Гэта асабліва важна з улікам таго, што адукацыйны працэс быў адным з галоўных інструментаў фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці;

4) аўтар аналізуе беларускія гімназіі як адносна аднастайную з'яву, але рэгіянальныя асаблівасці іх функцыянавання ў розных ваяводствах прапрацаваны недастаткова. Адрозненні паміж сітуацыяй у Віленскім, Навагрудскім і іншых ваяводствах маглі быць больш істотнымі з улікам асаблівасцей адміністрацыйнай практыкі ў асобных ваяводствах.

Выказаныя заўвагі носяць рэкамендацыйны і дыскусійны характар, істотна не ўплываюць на агульную станоўчую ацэнку працы.

Дысертацыйнае даследаванне «Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук адпавядае патрабаванням Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў, а яго аўтар Ананька Кірыл Дзмітрыевіч заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя **за:**

1) сістэмна-храналагічны аналіз станаўлення беларускага сярэдняга адукацыйнага працэсу; абгрунтаванне канцэптуальнай мадэлі эвалюцыі беларускага нацыянальнага сярэдняга школьніцтва ва ўмовах геапалітычных трансфармацый 1918-1939 гг. Выяўлены структурна-функцыянальныя заканамернасці ўтварэння і развіцця сеткі беларускіх гімназій як рэакцыі на змены ў міжнародна-прававых адносінах і нацыянальна-дзяржаўных працэсах. Распрацавана чатырохэтапная храналагічная мадэль, якая адлюстроўвае дыялектычны характар узаемадзеяння міжнародных дамоўленасцяў, польскай дзяржаўнай палітыкі і беларускіх нацыянальна-культурных імкненняў у сферы адукацыі. Навукова абгрунтавана, што кожны з этапаў характарызаваўся ўласнымі спецыфічнымі рысамі ўзаемаадносін паміж беларускімі адукацыйнымі ўстановамі і польскімі дзяржаўнымі структурамі;

2) прасапаграфічны аналіз сацыякультурнай структуры беларускага гімназічнага асяроддзя; распрацоўку комплекснай характарыстыкі вучнёўскага кантынгенту і педагагічнага корпуса беларускіх гімназій як унікальнага сегмента нацыянальнай інтэлігенцыі міжваеннага перыяду. На аснове статыстычнага аналізу біяграфічных дадзеных каля 3,2 тысяч навучэнцаў выяўлены сацыяльна-дэмаграфічныя, нацыянальна-канфесійныя і тэрытарыяльныя заканамернасці фарміравання беларускага гімназічнага асяроддзя. Навукова ўстаноўлена, што беларускія гімназіі сталі важным каналам сацыяльнай мабільнасці для сялянскіх слаёў насельніцтва і прыцягвалі дзяцей розных этнаканфесійных груп, што сведчыць аб іх

інтэграцыйным патэнцыяле ў шматнацыянальным грамадстве Заходняй Беларусі;

3) палітыка-структурны аналіз трансфармацыі беларускага адукацыйнага кантэксту; абгрунтаванне механізму уплыву палітычных працэсаў на інстытуцыянальныя змены ў беларускім гімназічным асяроддзі, які адлюстроўвае агульныя заканамернасці ўзаемадзеяння нацыянальных меншасцяў з дзяржаўнымі структурамі ў міжваеннай Заходняй Беларусі; выяўленне характару палітызацыі адукацыйнага працэсу, дзе беларускія гімназіі пераўтвараліся з культурна-асветніцкіх устаноў у арэну ідэалагічнага супрацьстаяння; устанаўленне, што радыкалізацыя моладзевага асяроддзя з’яўлялася вынікам сістэмнай палітыкі дыскрымінацыі нацыянальных меншасцяў, што прывяло да фарміравання антыпольскіх настрояў сярод беларускай студэнцкай моладзі;

4) вызначана поліфункцыянальная роля беларускіх гімназій як нацыянальна-культурных цэнтраў, якія аб’ядноўвалі ў сабе адукацыйную, выхаваўчую, культурна-асветніцкую, арганізацыйную і грамадска-палітычную дзейнасць. Гэтыя ўстановы выступалі асяродкамі не толькі перадачы ведаў, але і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, распаўсюджвання беларускай культуры, развіцця творчых і лідарскіх якасцяў моладзі, садзейнічалі захаванню і развіццю нацыянальных традыцый ва ўмовах палітыкі паланізацыі; выяўлена, што беларускія гімназіі з’яўляліся асяродкам педагагічных інавацый, дзе распрацоўваліся методыкі выкладання на беларускай мове, ствараліся арыгінальныя вучебна-метадычныя комплексы і фарміраваліся новыя падыходы да нацыянальна-патрыятычнага выхавання; абгрунтавана, што дзейнасць беларускіх гімназій выходзіла далёка за межы фармальнага адукацыйнага працэсу і ўяўляла сабой комплексную сістэму трансляцыі беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах асіміляцыйнага ціску з боку дамінуючай польскай культуры.

Дадзеныя навуковыя вынікі ў сукупнасці ўяўляюць сабой першае ў айчыннай гістарыяграфіі комплекснае даследаванне беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг., якое значна пашырае веды аб нацыянальна-культурных і адукацыйных працэсах у гэты складаны перыяд беларускай гісторыі.

Афіцыйны апанент –
загадчык кафедры гісторыі і сацыяльных навук
факультэта міжкультурных камунікацый
установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт замежных моў»,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.Г. Цымбал

26.09.2025

Учреждение образования
«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
УНИВЕРСИТЕТ ИНОСТРАННЫХ ЯЗЫКОВ»
Подпись А.Г. Цымбала
УДОСТОВЕРЯЮ
Зам. Начальник отдела кадров БГУИЯ
(Т.С. Луговская
«26» 09 2025 г.